Ба 23329

А. ЯКІМОВІЧ

# СЛУХАЙ—ЗАПАМІНАЙ

## АЗБУКА Ў ВЕРШАХ І МАЛЮНКАХ

Ян. 1953 г. Ба 23329 бр
Б ... 1984 г.
Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя дзіцячай літаратуры
Мінск 1948

25. 04. 2009



# А

Алік азбуку чытае,
Ада брату памагае.



# Б

Бацяны ў чырвоных ботах
Бродзяць важна па балотах.




# В

Вельмі мудры верабей
Вучыць грамаце дзяцей.



# Г

Гусі, гусі, ґусакі,
Гыля, гыля да ракі!



Д

Дрозд прачнуўся і спявае,—
Добры голас дроздзік мае!



# Е

Ехаў лесам на кані я,
Елкі там раслі густыя.



# Ё

Ёрш без рэчкі жыць не можа.
Ён калючы, нібы вожык.



Ж

Жук лятае і гудзіць:
Жу-жу-жу! жывот баліць.



# З

Змей узвіўся над лясамі.
Змея мы зрабілі самі.



І

Іней лёг у дзень марозны
І на елкі і на сосны.



К

Кошка мышак налавіла,
Кацянятак накарміла.



Л

Леў у лесе зарычэў,
Лес навокал задрыжэў.



М

Мячык, мячык добра скача,
Мячык б'юць, а ён не плача.



# Н

Наш Палкан зусім рахманы,
Не баімся мы Палкана.



# О

Орша—горад на Дняпры,
О—шукай у буквары.



# П

Пыл узняўся з-пад калёс:
Па дарозе едзе воз.



# Р

Рак—не рыба, ды ядуць,
Ракі ў возеры жывуць.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна
Інв. № 1953 г. БА 233295



# С

Салавей—малая пташка.
Салаўю спяваць не цяжка.



Т

Трактар з ворыва ідзе,
Трактарыст яго вядзе.



У

У калгасе „Першамай"
Убіраюць ураджай.



Ф

Федзя—хлопчык невялічкі,
Феня—Федзева сястрычка.



# Х

Хітры ліс цішком бяжыць:
Хоча пеўніка схапіць.




# Ц

Цэлы дзень я працаваў—
Цацкі брату майстраваў.



# Ч

Чайнік весела шуміць:
Чай гатоў, сядайце піць!



# Ш

Швачка наша цёця Юля
Шоўкам вышыла кашулю.



# Э

Этажэрка поўна кніг.
Эх, каб мог чытаць я іх!



# Ю

Юрка гальштук павязаў.
Юным ленінцам ён стаў.



# Я

Ягад шмат у нашым гаю.
Я ўсе літары ўжо знаю!

Бел. аддзел
Лутамат.
Бел. аддзел
1994 г.
B0000002766985

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ
А. Якимович
СЛУШАЙ — ЗАПОМИНАЙ
Азбука в стихах и рисунках
Государственное издательство БССР
Минск 1948 г.

Бібліятэка • БССР • імені ЛЕНІНА

Рэдактар Ул. Шахавец
Мастацкі рэдактар Н. Гуціеў
Тэхрэдактар Л. Прагін
Карэктар Ф. Зарубанава

АТ 02935 Падпісана да друку 18/XI—48. Тыраж 20 000 экз.
Папера 70×92//16. Друк. арк. 2. Заказ № 367.

Друкарня імя Сталіна, Мінск, Пушкіна, 55.